■ Медыяперсона

Алена НАСАЧОВА: «ДАСЯГНЕННІ НЕ «ПАДАЮЦЬ З НЕБА»

Яна з тых жанчын, якія на дробязі не разменьваюцца. Калі яна хоча нечага, то не траціць час на мары, а распрацоўвае план, каб дасягнуць жаданага. У свой час факультэт журналістыкі быў не адзінай перспектывай, але яна адчувала, што хоча трапіць на тэлебачанне. Сёння Алена працуе на «Беларусь 1» і міжнародным спадарожнікавым тэлеканале «Беларусь 24». Яна вядучая выпускаў «Навін», якія рыхтуе Агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі. Паспрабаваўшы сябе ў амплуа рэдактара, аўтара праграм адчувае сябе камфортна ў фармаце навін. Пра тое, як сны становяцца рэальнасцю, ці магчыма жыць у стане эйфарыі і чаму «зорная хвароба» абмінае Алену, «Звязда» даведалася з першых вуснаў.

Фота Іны АЛЬШЭЎСКАЙ.

Калі ты робіш крокі для дасягнення сваёй мэты, то вынік успрымаеш як заканамернасць, натуральна. І ў мяне на гэтым фоне не ўзнікае думкі, што я магу пазіраць на іншых звысоку.

— Навіны — ваш стыль жыцця. Як можна яго апісаць?

— «Навіны» — на сняданак, «Навіны» — на абед, а часта і замест яго, апошнія падзеі перад сном і сон, у якім... спазняешся на эфір...

— Ці здаралася, што такія сны паўтараліся ў рэальнасці?

— Такіх сітуацый баялася асабліва на пачатку працы. А сны былі вельмі частымі. У іх нават былі дэтэктыўныя сюжэты, калі ў мяне аўто зганялі, у якім ляжыць мікрафонная папка. Я сама ў гэты час знаходжуся ў Барысаве, а да эфіру застаецца дзесяць хвілін... Дзякаваць Богу, у рэальным жыцці сюжэты, набліжаныя да сноў, мелі лагічны характар. Рэальных спазненняў на эфір у маёй практыцы не здаралася. Быў толькі выпадак, калі ў нас была «прафілактыка» на канале. Пра яе ўсе ведалі, таму пасля ранішніх эфіраў мы з калегай вырашылі паехаць па сваіх справах. А праз нейкі час нам тэлефануюць з работы і запытваюць, дзе мы знаходзімся, бо праз дзесяць хвілін прамы эфір. Мы, добра разумеючы, што такое немагчыма, «ляцім» на студыю. І тут зноў тэлефонны званок, нам кажуць, што патурбавалі памылкова. Але стрэс тады адчулі жудасны.

— У свой час вы былі рэдактарам, вядучай, аўтарам праграм — якое з гэтых амплуа найбольш складанае ў выкананні?

— Амплуа навічка, калі толькі спасцігаеш азы. Думаю, так у любой прафесіі адбываецца да той пары, пакуль не «намацаеш» сутнасць, аснову, не зразумееш прынцып працы. А пасля таго, як гэта ўдаецца, то пачынаецца этап «адточвання майстэрства». І тут працэс не столькі карпатлівы, колькі азартны. Асабіста для мяне.

— Моманты «творчага крызісу» вам знаёмыя ці гэта проста спроба людзей апраўдаць сваю ляноту?

— Лянота з'яўляецца ці ад адсутнасці матывацыі, ці ад стомленасці. У мяне быў перыяд, калі менавіта ў творчым плане вельмі хацелася зрабіць паўзу, спыніцца, каб падумаць і раскласці ўсё па палічках... І гэта нармальна. Паглядзіце, вось, напрыклад, спартсмены падыходзяць да піку формы і нейкі час знаходзяцца ў такім стане, але ж не пастаянна. Але ніхто не кажа пра крызіс — усе ўспрымаюць такі ход падзей як натуральны. А чаму да творчых людзей стаўленне павінна быць іншым? Пагадзіцеся, жыць увесь час у стане эйфарыі немагчыма.

— Вы не першы год у эфіры. Тое самае адчуванне эйфарыі яшчэ прысутнічае?

— Эйфарыю адчуваю ад таго, што займаюся любімай справай.

— Часта вас гледачы пазнаюць на вуліцы?

— Здараецца. Часам падыходзяць і кажуць, што глядзяць мае праграмы. Чуць такое, безумоўна, прыемна. Бывае, сустракаюць мяне, доўга ўглядаюцца, а потым з пэўнай асцярожнасцю кажуць: «А якую праграму вы ведзяце, нагадайце, калі ласка». Такое таксама прысутнічае. Часта лаўлю проста дапытлівыя позіркі, магчыма, гэта зусім ніяк не звязана з папулярнасцю (*смяецца*).

— А так званая «зорная хвароба» вас абмінула?

— Я думаю, пытанне больш да тых, хто знаходзіцца побач. Хачу спадзявацца, што на «зорнасць» я не хварэла і не захварэю. Магчыма, калі вынікі «падаюць з неба», то ўспрымаюцца па-іншаму. А калі ты робіш крокі для дасягнення сваёй мэты, то вынік успрымаеш як заканамернасць, натуральна. І ў мяне на гэтым фоне не ўзнікае думкі, што я магу пазіраць на іншых звысоку.

— Фармат праграмы навін дазваляе вам эксперыментаваць з вобразам вядучай?

— Яшчэ як! Вы правільна заўважылі: фармат навін мае пэўныя рамкі. Сёння ў навінах стыль, як і раней, дзелавы, але «налёт рамантызму», на мой погляд, больш ярка прысутнічае, чым было гэта гадоў дзесяць таму. Тады немагчыма было ўявіць вядучую праграмы навін з распляценымі валасамі ў кадры, ды яшчэ і з завітымі локанамі. А зараз мы ўспрымаем такі падыход нармальна. Тое ж самае можна сказаць і пра адзенне. Нават рукаў «тры чвэрці» быў не заўсёды дапушчальным, цяпер жа блузы з рукавамі-«ліхтарыкамі» — ужо не забарона. Тэлебачанне становіцца больш набліжаным да жыцця. І гэта ў роўнай ступені датычыцца не толькі кантэнту праграмы, але і таго, што мы называем «карцінкай». Калі тэмпература па краіне плюс трыццаць, а з экрана на вас пазірае строгі твар у дзелавым касцюме, то будзе адзін узровень успрымання. І зусім іншы прыклад, калі вядучая — яна ж не з іншай планеты — паведамляе апошнія навіны, але апранутая ў рамках «фармату» і «па надвор'і» — узмацняецца эфект прысутнасці і прыналежнасці. А эксперыментаваць я люблю!

— Як ставіцеся да пераўтварэнняў, калі трапляеце ў рукі стылістаў?

— З вядучымі Агенцтва тэлевізійных навін працуюць высакакласныя майстры. Самае каштоўнае — яны не навязваюць сваё бачанне, а толькі далікатна падкрэсліваюць і раскрываюць індывідуальнасць, працуючы над вобразам. Атрымліваецца своеасаблівы творчы тандэм стыліста і вядучага. У выніку мы маем не сюрпрыз, а тое, што з'яўляецца ў працэсе прадуманай сумеснай працы. Я кажу пра свой вопыт, таму, працуючы з новымі стылістамі і візажыстамі, галоўнае — дакладна паставіць задачу і разам яе паспяхова рэалізоўваць!

— На экране вы строгая лэдзі, а ў жыцці...

— Якая я ў жыцці, думаю, лепш было б спытаць у маіх блізкіх і тых, хто мяне добра ведае... Мабыць, бываю рознай. Перфекцыяністка — гэта дакладна. Праўда, я вучуся быць ёю не заўсёды, вучуся ўзнагароджваць сябе нават за невялікія перамогі і дасягненні...

— Дачка любіць пераймаць вашы паводзіны?

— Менавіта так, пераймаючы нешта ад дарослых, дзеці і спасцігаюць многае ў жыцці. У нас недзе нават ёсць яе фотаздымак, дзе яна ў маіх упрыгажэннях, у туфлях на абцасах і з папкай у руках. Такое здараецца перыядычна. І Наташа, і Жэня часам нават збіраюцца адзявацца са словамі «ну, я паеду на працу!»

— Кажуць, у дзяцей можна шмат чаму навучыцца, вы згодны з гэтым?

— Безумоўна. Мне здаецца, што яны больш дарослыя, чым былі мы ў дзяцінстве. Наташа нарадзілася мудрай. Часам яна гаворыць, разважае так, быццам чалавек, які мае багаты жыццёвы вопыт за плячыма, зусім не па-дзіцячы. Жэня, хоць і малодшы за яе, але не саступае сястры ў гэтым. Памятаю, яму было гады два з паловай, калі ў адной нялёгкай сітуацыі ён сказаў: «Трэба галавой думаць!»

— Што важна ў выхаванні дзяцей?

— На жаль, быць бацькамі не вучаць ні ў школе, ні ва ўніверсітэце... А выхаванне — цэлая навука, і не адна! Я думаю, для таго, каб закласці ў дзіця нешта, трэба, як мінімум, каб адносіны базаваліся на даверы. Бо калі бацькі штучна ўзносяць сябе на п'едэстал і адтуль спрабуюць нешта сваім дзецям данесці, то, магчыма, тыя да нечага і прыслухаюцца, і нават вырастуць выхаванымі людзьмі, але з вялікай колькасцю пабочных эфектаў у выглядзе комплексаў. Таму я супраць аўтарытарных метадаў выхавання. І разам з тым, чым раней дзіця зразумее, што ў грамадстве існуюць пэўныя рамкі паводзін, што ў кантакце з іншымі людзьмі трэба паважаць іх межы, як і свае асабістыя, і г.д., тым лягчэй ім будзе арыентавацца ў жыццёвай прасторы.

Алена ДРАПКО.

ФІЛАСОФІЯ ПАЧУЦЦЯ

Анталогія беларускага верша пра каханне

Песняй вясны лебядзінаю...

Вядучы Алесь Каско

Каханне — гэта перш за ўсё моцнае шчымлівае пачуццё, якое забірае чалавека ўсяго, паглынае ўсялякую разважлівасць у яго сардэчных памкненнях, робіцца душэўнай асалодаю ў радасці і смутку адначасна. Не дзіва таму, што ў любоўнай лірыцы так багата эмацыйнага напалу. Аднак не менш захапляюць сапраўдных аматараў паэзіі творы вонкава стрыманыя, дзе пачуцці тояцца ў глыбіні роздумнай інтанацыі і насычанасці вобраза.

Філасофійя адзінства і вернасці ў каханні адметны верш В. Віткі «Яліна і клён»; яна ўвасоблена ў вобразе-сімвале скрыпкі, аснову для музыкі якой даюць два гэтыя дрэвы ў неад'емным сваім спалучэнні.

Філасофія прыгажосці і мімалётнасці кахання, як і самога жыцця, — у вершы С. Блатуна. Смутак і жаль між тым перажываюцца паэтам мудра, без роспачы: настае час, і шчаслівыя імгненні пераходзяць наступнікам; адсюль у яго столькі замілаванасці да дзяўчынкі з яе прэтэнзіяй на летуценных матылькоў...

Васіль ВІТКА

ЯЛІНА І КЛЁН

Два дрэвы злучылі свае галасы
І скрыпкаю сталі абое.
Скрозь і паўсюды, ва ўсе часы
Людзі іх песню завуць
любоўю.

Сэрца адное
У клёна, яліны.
Разам яны
да апошняй хвіліны.

Змоўкне яліна, клён не зайграе,
Дзынкне струною —
І памірае.

Сымон БЛАТУН

* * *

На твае залацістыя косы,
Помню, селі два матылькі,
Быццам макі пунсовыя.
Там яны і заблыталіся,
Пачалі трапятацца...
Доўга яны трапяталіся.
А аднойчы на лузе даспелым
Раптам пырхнулі — і паляцелі.
Як шкада! Я пабег наўздагон,
Каб спаймаць матылькоў тых жаданых...
Доўга бег... Раптам бачу —
паселі
На льняную галоўку дзяўчынкі,
Што гуляла ля хаты ў класы,
Пачалі, як раней,
трапятацца...
Падышоў,
зняць хацеў іх рукою,
Ды дзяўчынка сказала
з дакорам:
— Не чапай,
ты ўжо дзядзя вялікі,
Гэта будуць мае матылькі.

■ Медыяпрастора

Брэст	106.6 FM
Віцебск	101.8 FM
Мінск	107.1 FM
Гродна	104.2 FM
Магілёў	107.8 FM
Бабруйск	103.6 FM
Баранавічы	98.4 FM
Салігорск	104.3 FM
Пінск	103.2 FM

Зазірнем «У бардачок»!

Як у спякоту хутчэй астудзіць салон аўтамабіля і пры гэтым не застудзіцца ад кандыцыянера? Як пазбавіцца ад паху цвілі ў машыне? Для чаго нават у самае гарачае надвор'е кандыцыянер у аўтамабілі часам неабходна адключаць? Пра гэта і многае іншае вы можаце даведацца ў аўтарскай рубрыцы Аляксея Аніковіча «У бардачок» на радыё «Мір». Гэта праграма пра аўтамабілі і для аўтамабілістаў. Ці можна ехаць на аўтамабілі ў навальніцу, чаму ў падарожжа лепш ехаць на дзвюх прыкладна аднолькавых машынах? Як прывучыць ката ці сабаку да паездак на машыне, ці варта аб'язджаць на высокай хуткасці вожыка ці жабу і пра што сведчаць чорныя тармазныя палосы на гладкай дарозе? У аўташколе такіх тонкасцяў не раскрыюць, а вось на хвалях радыё «Мір» — калі ласка!

На дарозе шмат аварыйных, незвычайных, дурных, вясёлых і часам загадкавых сітуацый. Вядучы Аляксей Аніковіч падкажа і раскажа пра ўсе нюансы бяспечнага і камфортнага перамяшчэння ў аўтамабілі. Рэкамендацыі ДАІ, інфармацыя пра сітуацыю на дарогах горада, а таксама апошнія навіны аўтасвету і аўтамабільныя кур'ёзы — усё гэта праграма «У бардачок». Слухайце штодня па буднях у 08:45, 13:15 і 18:45 на радыё «Мір»!

■ Да ведама

З ЧЫМ ЯДУЦЬ РАДЫЯЦЫЮ

Усё, што сабрана ў лесе, падлягае абавязковаму радыяцыйнаму кантролю. Пра меры бяспекі нагадваюць спецыялісты ў галіне радыяцыйнай гігіены. Гэта актуальна на тэрыторыях, якія пацярпелі ад чарнобыльскай аварыі.

Фота БЕЛТА.

Сезон збору дароў лесу ў самым разгары. На рынках у Магілёўскай вобласці цяпер шмат грыбоў. У вёдрах грыбнікоў — не толькі лісічкі, таксама падасінавікі і падбярозавікі. І далёка не ва ўсіх зверху ляжаць лісткі з вынікамі проб на наяўнасць радыяцыі.

Між тым гэта вельмі важна — каб грыбы і ягады, як жартуе народ, «не свяціліся». Штогод прыкладна 25-30% ад усіх проб ягад і грыбоў, якія паступаюць на даследаванне, не адпавядаюць допушчальным нормам па радыеактыўным цэзіі, паведаміў загадчык аддзялення радыяцыйнай гігіены Магілёўскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Леанід Ліпніцкі.

Найбольш нядобранадзейнымі ў сэнсе забруджвання дароў лесу застаюцца на Магілёўшчыне наступныя раёны: Слаўгарадскі, Чэрыкаўскі, Краснапольскі, Клімавіцкі, Бялыніцкі, Быхаўскі, Клічаўскі, Магілёўскі, Чавускі. Гігіеністы яшчэ раз нагадваюць, што радыяцыя не мае ні колеру, ні смаку, ні паху. Адразу пасля спажывання забруджанай радыяцыяй грыбоў ці ягад не будзе назірацца вострых і яўных сімптомаў. Нават калі вы з'ясце іх вядро. Але радыяцыя назапашваецца ў арганізме чалавека паступова: рэгулярнае ўжыванне ў ежу забруджаных прадуктаў можа прывесці да абвастрэння хвароб.

Таму ў Магілёўскім абласным цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя выпрацавалі нескладаныя парады аматарам дароў лесу, якія іх збіраюць, альбо набываюць на рынках. Пакупнікам трэба прасіць у прадаўцоў дакументы аб праходжанні радыяцыйнага кантролю. Норма на лясныя ягады — 185 Бк/кг, а на свежыя грыбы — 370 Бк/кг. Спецыялісты раяць не збіраць грыбы і ягады на забруджаных тэрыторыях. Трэба ўважліва глядзець на папераджальныя знакі каля лесу, карыстацца інфармацыяй лясной гаспадаркі аб узроўні радыяцыі.

Радыеактыўнасць дароў лесу залежыць ад іх віду. Чарніцы, брусніцы, буякі і журавіны больш, чым іншыя лясныя ягады, назапашваюць радыеактыўныя рэчывы. Меней за ўсё забруджваюцца ягады каліны, маліны, ажыны.

Лісічкі, баравікі, абабкі і падасінавікі належаць да групы грыбоў, якія назапашваюць радыяцыю на сярэднім узроўні. Апенькі найбольш бяспечныя. Затое польскія грыбы, маслякі і махавікі ўвогуле не рэкамендуецца збіраць, бо яны з'яўляюцца акумулятарамі радыяцыі.

І самае галоўнае, даюць параду гігіеністы, не забывацца на правілы перапрацоўкі грыбоў і ягад, калі ёсць сумненні ў іх радыяцыйнай бяспецы. Ягады і грыбы трэба абавязкова пачысціць ад частак раслін, моху і глебы і некалькі разоў прамыць у праточнай вадзе.

Зніжэння колькасці радыяцыі ў грыбах можна дасягнуць іх варкай у некалькіх салёных водах, з дабаўленнем лімоннай кіслаты ці воцату. Праз кожныя 15 хвілін мяняйце ваду, і канцэнтрацыя праз гадзіну можа знізіцца ў дзесяць разоў. Праўда, разам з гэтым зніжаецца і колькасць пажыўных рэчываў у грыбах. Затое будзе не проста смачна, але і бяспечна.

Ілона ІВАНОВА

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

ПАНЯДЗЕЛАК, 5 ЖНІЎНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.10** Навіны.
7.05, 8.05 Дзелавое жыццё.
7.10, 8.10, 19.40, 22.55 Зона Х.
9.10 У цэнтры ўвагі.
10.00 Камедыя «Жандар у Нью-Ёрку».
12.10 Дзень у вялікім горадзе.
13.15 «Зорнае жыццё». «Бітва за дзяцей».
14.15 Вакол планеты.
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25 Журналісцкае расследаванне.
15.55 Дак. фільм «Ігар Лучанок. Мелодыя лёсу».
16.55 Меладрама «Кахаць па-руску».
19.20 Спецыяльны рэпартаж АТН.
20.00 Серыял «Земскі доктар. Жыццё нанова».
21.00 Панарама.
21.45 Серыял «Вербная нядзеля», 1-я серыя.
23.30 Дзень спорту.
23.40 Трылер «Прывід».

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Раніца.
9.00, 21.20 Тэлебарометр.
9.05, 17.55 Дэтэктыў «Замах».
10.15 Дак. серыял «Пад сонцам», 1-я серыя.
11.05 Фільм-казка «Чарадзейная лямпа Аладзіна».
12.30 Меладрама «Пяць крокаў па аблоках», 1-я — 4-я, заключная, серыі.
16.10 Пад грыфам «Вядомыя».
16.45, 1.00 Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».
18.55 Серыял «Людзі Шпака».
21.25 КЕНО.
21.30 Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан. «Смяротная схватка».
22.55 Тэніс. Таронта. Жанчыны.

БЕЛАРУСЬ 3

8.00, 12.00, 16.00, 23.15 «Мой горад». Брэст.
8.15, 20.15 «Росчырк часу». Рэпін у Здраўнёва.
8.30 «Жалезныя майстры». Дак. фільм.
8.40 «Расце дуб...». Дак. фільм.
9.00 «Творцы».
9.30 «Уладзімір Цэслер. Чыз!». Дак. фільм.
10.00, 17.30 «Не пакідай». Фільм-казка, 1-я серыя.
11.10 «Матэрыя вобраза». Дак. фільм.
11.40 «Мусаргскі: «Наперад да новых берагоў!». Дак. фільм.
12.15, 20.55 «Кветкі правінцыі». Меладрама.
13.40 «Тэатр. Выбранае».
14.20 «Скандаліст, ці Пісьмы пра каханне». Віктар Шклоўскі.
14.45 «Ілюзія рэальнасці. Уражанне раўнавагі». Дак. фільм.
15.15 «Карані».
15.45 «Музеум».
16.15, 22.20 «Марк Шагал. Майстэрства кахання». Дак. фільм.
17.05 «Гісторыя беларускай страўні». Мясныя прысмакі.
18.45 «Лясныя хованкі». Навукова-папулярны фільм.
19.00 «Незнаёмая песня». Маст. фільм.
19.30 «Святыні полацкай зямлі». Дак. фільм.
19.45 «Скарбніца Міншчыны». Рубяжэвічы.
20.30 Калыханка.

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.05 «Жыць здорава!».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 Серыял «Закрытая школа».
12.10 Серыял «Жаночы доктар 2».
13.10 «Добрага здароўечка!».
13.55 «Модны прыгавор».
14.55 «Валянціна Лявонцьева. Прызнанне ў любові».
16.15 «Зразумець. Дараваць».
16.55 «Давай пажэнімся!».
18.20 «Адваротны адлік». «Беларуская шляхта. Ад падзелу да разбору».
19.00 «Чакай мяне».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Выходжу цябе шукаць 2».
22.15 Серыял «Цюдоры».
0.15 Маст. фільм «Маленькія сакрэты».
2.50 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 «Тыдзень».
9.40 «Вялікае снеданне».
10.20 «Глядзець усім!».
10.40, 17.30 «Званая вячэра».
11.35 Серыял «Слова жанчыне».
12.30 «Джэймі ў сябе дома».
13.00 «Жанчыны ХХ стагоддзя».
13.50 «Вялікі горад».
14.30 «Зорны рынг». Дайджэст.
15.30 «Ежа багоў».
16.20 «Наша справа».
16.50 «Пад абаронай».
18.30 «Падманутыя навукай».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Добры вечар, малы».
20.30 Маст. фільм «Матадор».
23.00 «Ваенная тайна».
0.40 Серыял «Турысты».

МІР

5.00 Серыял «Агонь кахання».
6.40 М/с «Арабела вяртаецца».
7.05 «Цік-так».
7.20 М/с «Смяшарыкі».
8.30 Серыял «Ёхан ды Мар'я».
9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.10, 3.25 Маст. фільм «Чацвёртая планета».
10.40 «Даведнік».
11.10 Дак. фільм «У свеце цудаў. Фільм».
12.25 Серыял «Блізняты».
14.00 «Сакрэтныя матэрыялы».
14.30 «Агульны інтарэс».
15.25 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
17.00, 22.15 Ток-шоу «Слова за слова».
18.30, 0.50 Серыял «Закон і парадак».
21.25 Дак. фільм «У свеце людзей».
23.15 Серыял «Мужчыны не плачуць».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
10.55 Надвор'е на тыдзень.
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Ранішняя@пошта».
12.00 «Прамы эфір».
13.00 «Асаблівы выпадак».
13.50, 16.50, 19.50, 23.30 Навіны — Беларусь.
14.30 Ток-шоу «1000 дробязяў».
15.10 Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
15.55, 22.30 Серыял «Скліфасоўскі».
17.10 Серыял «Ефрасіння. Таежнае каханне».
18.00 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».
18.55 Серыял «Пацалуйце нявесту!».
20.40 Серыял «Тайны следства-12».
23.40 «Аркадзь Кашко. Геній рускага вышуку».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
8.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.05 Сёння.
11.00 «Да суда».
11.55 «Суд прысяжных».
13.30 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
15.10 «Справа густу».
15.40, 18.30 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
16.25 «Пракурорская праверка».
17.35 «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
19.35 Серыял «Масква. Тры вакзалы».
21.20 Серыял «Ікраны барон».
23.30 Серыял «Глухар. Вяртанне».

8 КАНАЛ

7.00, 11.45, 18.35, 21.00, 23.50 «Надвор'е».
7.05 «На рыбалку».
7.20 М/с «Ліга справядлівасці».
7.40, 14.20 Серыял «Эліза».
9.15, 17.45 Серыял «Дзённікі вампіра».
10.00 «Сінематограф». Маст. фільм «Гэта здарылася аднойчы ўначы».
11.50 Драма «Помста».
14.00 «Кінаблакнот».
16.00 Мультпарад.
16.30 «Мой любімы гадавальнец».
17.00 Серыял «Клан Кенэдзі».
18.40 Серыял «Праслушка».
20.45 «Вечарніца».
21.05 Драма «Фірма».

ВТБ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 1.00 «PLAY».
8.00, 14.00, 18.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
8.30, 17.30 «С.У.П.».
9.00 «Жонкі алігархаў».
10.00, 19.00 Серыял «Метад Лаўровай».
11.00, 22.20 Серыял «Маргоша».
12.00 Скетч-шоу «Адны дома».
12.30 «Куды прыводзяць мары».
13.00, 16.30 Скетч-шоу «Анекдоты».
13.30, 17.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
14.30, 23.30 «Улётнае відэа».
15.00 Серыял «Кадэцтва».
16.00, 18.30 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
20.00 Серыял «Татавы дочкі. Нявесты».
21.10 Серыял «Дзённік доктара Зайцавай».
0.00 «Дарожныя войны».
0.30 «Ч.П?».

ІНТЭР+

7.00 Раніца з ІНТЭРам.
9.00 Музыка з Украіны.
9.10 Маст. фільм «Між высокіх хлябоў».
10.25, 16.45, 01.20 Сямейны суд.
11.15, 23.55 Феерыя падарожжаў.
11.35, 22.45 Легенды бандыцкай Адэсы.
12.00, 19.35, 2.35 Код доступу.
12.25, 15.40, 0.20 Дак. серыял «Жывое багацце Украіны».
12.45, 18.20, 5.10 Серыял «Анёл-ахоўнік».
13.30 Пазаочы.
14.10, 23.05 Дак. серыял «Галівудскія пары».
15.00, 0.40 Судовыя справы.
16.00 Формула кахання.
17.30, 4.20 Давай пажэнімся!
19.05, 2.05 Праверана на сабе.
20.00, 3.00 Падрабязнасці.
20.30 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
21.15, 3.30 Серыял «Калі нявеста ведзьма», 1-я серыя.
22.00, 5.55 Серыял «Служба 21, або Думаць трэба пазітыўна».
6.40 Краіна смяецца.

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Быў час». 2009 год.
6.00 «Наша біяграфія». Дак. фільм.
7.00 «Вакол смеху». 1981 год.
8.30 «Бамонд». 1992 год.
9.00 «Мама Ануш». Маст. фільм.
10.20 «Ля мікрафона Юрый Левітан». Дак. фільм.
11.00 «Такія розныя клоўны». Фільм-канцэрт.
12.00, 3.00 «Колба часу».
13.00 «Іван Фёдаравіч Шпонька і яго бабуля». Тэлеспектакль.
14.00 «Шынок 13 крэслаў». 1968 год.
15.10 Творчы вечар Гелены Веліканавай у тэатры Эстрады. 1991 год.
16.25 «У. Давыдаў і Галіяф». Кароткаметражны фільм.
17.00 «...Да 16 і старэйшым». 1989 год.
18.00 «Вялікія імёны Расіі. Станіслаўскі». Дак. фільм.
18.40 «Людзі і манекены», 1-я серыя. Маст. фільм.
20.00, 2.00 «Час».
21.00 «Народжаныя ў СССР».
22.00 «КВЗ». 1987-88 гг.
23.00 «Ад усёй душы. Юбілейныя сустрэчы». 1977 год.
0.05 «Ранішняя пошта». 1983 год.
0.40 «Мяжа магчымага», 5-я серыя. Маст. фільм.
4.00 «Погляд». 1988 год.

EUROSPORT

9.30 Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
10.15 Супербайк. Чэмпіянат свету.
11.00 Экстрэмальныя віды.
11.30, 16.00, 19.00, 23.30 Плаванне. Чэмпіянат свету. Фіналы.
13.00, 17.00, 20.45, 1.00 Легенды лёгкай атлетыкі.
14.00, 18.00 Веласпорт. Аднадзённая гонка.
15.00 Супербайк. Чэмпіянат свету.
21.45, 2.00 Вось гэта дзіва!!!
22.00, 23.30 Пра рэстлінг.
2.15 Мотаспартыўны часопіс.

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05 «Паміж намі».
5.15, 5.35, 8.00, 8.20, 13.00, 13.30, 2.20, 2.45 Серыял «Доўга і шчасліва».
6.00, 7.45, 8.45, 13.50, 15.40, 16.45, 20.45, 21.50, 23.45, 3.05 «Камедыянты. Лепшае».
6.15 Камедыя «Лютыя стварэнні».
9.00 Камедыя «Дзейнічай, сястра 2. Старыя звычкі».
11.15 Камедыя «Атрад Беверлі Хілз».
14.10 Камедыя «Мая каханая брунетка».
16.00, 16.20, 21.00, 21.25 Серыял «Бет!».
17.20 Камедыя «Мужчына па выкліку».
19.20 Камедыя «Вяселле ў Каляды».
22.10 Камедыя «Ігра ў чатыры рукі».
0.10 Камедыя «Дурням закон не пісаны».
3.25 Камедыя «Другі хор».

ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

2.00, 8.00, 14.00 Кінаальманах «Жартуеце?».
3.25, 9.25, 15.25 М/с «Вох і Ах». Кінааповесць «Пажар у флігелі».
4.00, 10.00, 16.00 М/с «Вялікая энцыклапедыя прыроды». Казкі: «Залатыя каласы», «Бесталковы Вомбат».
5.00, 11.00, 17.00 Фільм-казка «Лятучы карабель». М/ф «Мурзілка на спадарожніку».
6.30, 12.30, 18.30 М/с «Легенда пра Зора».
7.00, 13.00, 19.00 «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф: «На чорны дзень», «38 папугаяў». «Салют, Алімпіяда!».

ТБ3

6.00 М/ф.
9.00, 18.30, 01.50 Серыял «Фатмагуль».
10.45, 17.00 Дак. серыял «Паралельны свет».
11.45, 16.00 Дак. серыял «Варажбітка».
12.45, 18.00 Дак. серыял «Паляўнічыя на прывідаў».
13.30 М/ф «Ледніковы перыяд 2: Глабальнае пацяпленне».
15.05, 23.30, 3.50 Серыял «Менталіст».
20.45 Серыял «Апошняя сустрэча».
21.45, 4.30 Маст. фільм «Смерць Яна».
0.15 Серыял «Звышнатуральнае».
1.00 Серыял «Паляўнічыя на чужых».

ТБ1000

5.00, 12.35 Трылер «Забытае».
6.40 Трагікамедыя «Новая калядная казка».
8.30 Трагікамедыя «Мачаха».
10.40 Драма «Забытыя жаданні».
14.15 Камедыя «Сур'ёзны чалавек».
16.15 Меладрама «Змяркание».
18.30 Трагікамедыя «Кірмаш ганарыстасці».
20.55 Драма «Светлячкі ў садзе».
22.45 Камедыя «Тэрмінал».
1.00 Драма «Чалавек, якога не было».
3.05 Жахі «Ключ ад усіх дзвярэй».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.00 Драма «Поп».
8.15 Камедыя «Стэп бай стэп».
10.10 Драма «Не рабіце бісквіты ў дрэнным настроі».
12.00 Драма «Дон-Кіхот».
14.00 Камедыя «Зайцаў, палі! Гісторыя шоумена».
16.00 Драма «Князёўна Мэры».
18.00 Камедыя «Кантракт на каханне».
20.00 Камедыя «Шапіто-шоу: Каханне і сяброўства».
22.00 Меладрама «Івановъ».
1.00 Драма «Каўказская рулетка».
2.35 Баявік «Шлях».
4.40 Меладрама «Гувернантка».

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 21.00, 1.00, 4.00 Ліхтугі за мяжой.
6.00, 10.00 Кракадзілы Катумы.
7.00 Дзікая прырода Амерыкі.
8.00, 8.30, 16.00, 16.30 Шукальнікі скарбаў.
9.00, 12.00, 17.00 Аўта-SOS.
11.00, 19.00 Уцёкі.
13.00, 18.00, 23.00 Апакаліпсіс.
14.00 Галівудскі мядзведзьзабойца.
15.00 Самыя небяспечныя жывёлы.
20.00, 0.00, 3.00 80-я: Найвялікшыя футбольныя моманты.
22.00, 2.00 Паранармальнае.

DISCOVERY

7.00, 16.25 Залатая ліхаманка.
7.50, 8.15 У мяне атрымалася!
8.40, 20.05 Патрабуецца зборка.
9.10, 20.35, 4.45 Як гэта зроблена?
9.35, 10.05, 17.20, 17.50 Паляўнічыя на рэліквіі.
10.30 Як уладкаваны Сусвет.
11.25, 3.55 Разбуральнікі легендаў.
12.20, 12.45, 3.05, 3.30 Вытворчасць: гонка з часам.
13.15, 0.55 Top Gear.
14.10, 6.05 Аўтамайстэрні.
15.05 Махінатары.
15.30, 5.10 Змеяловы.
18.15 Заплыў з пачварамі.
19.10 Рачныя монстры.
21.00 Палёты ўглыб Аляскі.
22.00 Паветраныя дальнабойшчыкі.
23.00 Эд Стафард: голае выжыванне.
0.00 Вялікія танкавыя бітвы.
1.50 Вершнікі пекла.
2.40 Маланкавыя катастрофы.